зіі «Фаўст» І.В.Гётэ (1976), «Санеты Арфею» Р.М.Рыльке (1982), паэму «Польскія кветкі» Ю.Тувіма (1984), кн. лірыкі «Белы алень» В.Бэлшэвіцы (1985) і інш. Выдаў зб. выбраных перакладаў «Прыйдзі, стваральны дух» (1986), пераклаў на бел. мову «Найвышэйшую песню Саламонаву» (1994), «Новы запавет. Псалтыр» (1995), «Біблію» (2002). Аўтар перакладаў п'ес для тэатраў Беларусі: «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера (1968), «Каханне пад вязамі» О'Ніла (1994) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

**СЁМУШНЫЯ ПЕСНІ**, традыцыйныя песні, жанравая група песень, якія суправаджалі свята Сёмухі (Тройцы). С.п. былі генетычна звязаны са старж. святам ушанавання продкаў і расліннасці. Гал. рытуальным дзеяннем свята было завіванне бярозкі: «Ты не радуйся, зелен дуб! // Не к табе ідзём — к бярозе, // Не цябе заўём — бярозку, // Заўём бярозку сосенкаю — // Звянчаем Аксенку з Сенічкам». У некаторых песнях «дзеўкі красныя» нясуць да бярозы «яешні смачныя», // Гарэлку горкую, скрыпку звонкую...» У гэтых творах ежа набывала рытуальны сэнс. З бярозаю быў звязаны і абрад кумлення, калі дзяўчаты пераходзілі на новы этап адносін, станавіліся добрымі сяброўкамі. Падчас абраду дзяўчаты звязвалі вершаліны 2 суседніх бяроз і праходзілі парамі пад утваранай аркай (вянком), спяваючы: «Ну-тка, кума, пакумімся! Ну-тка, дзеўка, пагалубімся! // Ты мне кума, а я табе, // З кумой скуміліся, // Душа з душой злюбіліся...» С.п. мелі і іншае абрадавае прызначэнне, звязанае са шлюбам. Спалучэнне земляробчых і шлюбных матываў у сёмушнай абраднасці тлумачылася тым, што шлюб быў звязаны не толькі з неабходнасцю працягнення роду, але і атаясамліваўся з урадлівасцю зямлі. Даволі распаўсюджанымі былі С.п.-варожбы на прадказанне лёсу. Дзяўчаты кідалі вянкі «на чыстыя воды», прасілі: «пра долю кажыце», ці будуць яны «жывы да цёплага лета», ці «спалюбяць іх «хлопцы ўдалы», «ці павядуць... у свае дамы». Лакальнай асаблівасцю з'яўляліся *куставыя песні*, гал. прызначэннем якіх было спрыяць будучаму ўраджаю, што пераканаўча раскрываецца ў песенным двухрадкоўі: «Дзе куста вадзілі, там пшанічанька радзіла». Пры выкананні куставых песень стваралася асаблівая атмасфера даверлівасці паміж удзельнікамі гурта і слухачамі. Апошнія часта ўцягваліся «дзявоцкім войскам» у выкананне песень і танцаў разам з Кустом.

*Літ.*: Веснавыя песні. Мінск, 1979; Шарая В.М. Абрад завівання і развівання бярозкі на Тройцу: структура, функцыянальныя асаблівасці. Мастацкі свет песень // Каляндарна-абрадавая паэзія. Кн. 1. Мінск, 2001. *А.М.Аляхновіч.*

**СІДАРАЎ** Юрый Уладзіміравіч (8.5.1927, с. Рап'ёўка Саратаўскай вобл., Расія — 9.1.2004), беларускі акцёр, педагог. Нар. артыст Беларусі (1977).



*Ю.У.Сідараў.*

Скончыў Маскоўскае тэатр. вучылішча імя М.С.Шчэпкіна (1949). Працаваў у Гродзенскім абл. драм. тэатры, з 1954 у Нац. акадэмічным драм. тэатры імя М.Горкага. Адначасова з 1968 выкладаў у Бел. акадэміі мастацтваў. Творчасці С. уласцівы лаканічныя выразныя сродкі, знешняя стрыманасць пры ўнутранай напружанасці, дакладнасць дэталей, пластычнасць маст. вобраза. Выканаўца гераічных, лірычных, вострахарактарных, камедыйных роляў: лейтэнант Наганаў, палкоўнік Кусонскі, паліцай Зыль («Брэсцкая крэпасць», «Галоўная стаўка», «Дзеля жыцця»



*Ю.Сідараў у ролі Ягора Булычова.*

К.Губарэвіча), Гарачун («Білет у мяккі вагон» А.Маўзона), Дробыш, Хазяінаў («Трывога», «Соль» А.Петрашкевіча), Чарвякоў («Знак бяды» паводле В.Быкава), Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Пратасаў, Бардзін, Ягор Булычоў, Бубнаў, Жан («Дзеці сонца», «Ворагі», «Ягор Булычоў і іншыя», «На дне», «Букееў і кампанія» паводле п'есы «Якаў Багамолаў» М.Горкага), Дасберген Мустафаеў («Узыходжанне на Фудзіяму» Ч.Айтматава і К.Мухамеджанава), Актавій Цэзар, Банка («Антоній і Клеапатра», «Макбет» У.Шэкспіра) і інш. Здымаўся ў кіно («Полымя», «Атланты і карыятыды» і інш.).

**СІЛАБА-ТАНІЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДАННЕ**, сістэма вершавання, у аснове якой — раўнамернае чаргаванне націскных і ненаціскных складоў. Ужываецца перш за ўсё ў мовах з пераменным месцам націску (бел., рус., укр., англ., ням. і інш.). Рытм сілабатанічнага верша ствараецца таксама чаргаваннем у вершаваных радках аднолькавай колькасці складоў (як у сілабічным вершаскладанні). С.-т.в. карыстаецца 5 метрамі (ямбічным, харэічным, дактылічным, амфібрахічным і анапестычным) і вял. колькасцю вершаваных памераў. У бел. фальклоры ўпершыню зафіксавана ў 16 ст. Найб. пашырылася ў 18—19 ст., што прывяло да ўзнікнення ў канцы 18 ст. бел. літ. сілаба-тонікі. Кан-